LEMANTAR



ЛЕМАНТАР

J. H.

LEMANTAR

dla školaŭ i chatniaha navučańnia

ЛЕМАНТАР

для школаў і хатняга навучаньня

Vyd. ZARANKA

NEW YORK, 1964

Zaŭvahi da Lemantara

Hety lemantar układzieny pavodla hukavoha metadu, jak układalisia j jinšyja biełaruskija lemantary ŭ 20-tych hadoch. Roźnica chiba tolki taja, što ŭ jim złučany dva šryfty — łacinka j kirylica.

Biełarusy z daŭnych časoŭ karystalisia dvuma šryftami. U našym lemantary łaciničny šryft pastaŭleny kirujučym z dvuch mierkavańniaŭ: adno, što jon z navukovaha hledzišča lepiej nadajecca dla vyjaŭleńnia vyraznaści hukaŭ u biełaruskaj movie, a druhoje, što dzieci našych emihrantaŭ pierš-napierš vyvučajuć u škole movu tych narodaŭ, u vasiarodździ jakich žyvuć. A tolki pa niejkim časie ŭ svajich niadzielnych škołach ci doma pačynajuć vyvučać svaju rodnuju movu. Pierachod ad jinšaj da rodnaj movy budzie šmat lahčejšym dla dziaciej, kali biełaruski tekst čytańnia pieradavać łacinskimi litarami, jakija jany ŭžo navučylisia čytać i pisać, kali vyvučali jinšuju movu.

Hetki paradak navučańnia jakraz adpaviadaje pedahahičnym i metadyčnym patrabavańniam: "Ad blizkaha j viadomaha da dalokaha j nieviadomaha". Bo, na vialiki žal, balšyni našym dzieciam, što apynulisia ŭ inšamoŭnym asiarodździ, mova hetaha asiarodździa, u jakoj jany vymušany vučycca, byvaje bližejšaj i bolej viadomaj, čymsia svaja rodnaja mova. I voś tut łacinka spryjaje chutčejšamu i lahčejšamu navučańniu rodnaj movy, bo nia budzie patreby tracić šmat času na vyvučeńnie litaraŭ i napisańnia jich. A paźniej, kali dzieci ŭžo aznajomiacca z biełaruskim tekstam čytańnia j piśma, budzie zusim lohka pierajści na kiryličny tekst čytańnia j piśma. Hetkaje vyvučeńnie budzie składać sucelny kampleks z pastupovymi pavarotami ad inšaj da svajej rodnaj movy z usimi jejnymi asablivaściami. Lemantar budzie dobra nadavacca j dla tych dziaciej, jakija čužoj movy zusim nie vyvučali.

Što da źmiestu, dyk układalnik lemantara kiravaŭsia na fałklorny j krajaznaŭčy matarjał, kab našy dzieci praz lemantar z dapamohaj nastaŭnikaŭ i baćkoŭ mahli vyrabić sabie ŭjaŭleńnie ab našym rodnym kraju.

Заўвагі да Лемантара

Гэты лемантар укладзены паводля гукавога мэтаду, як укладаліся й іншыя беларускія лемантары ў 20-тых гадох. Розьніца хіба толькі тая, што ў ім злучаны два шрыфты — лацінка й кірыліца.

Беларусы з даўных часоў карысталіся двума шрыфтамі. У нашым лемантары лацінічны шрыфт пастаўлены кіруючым з двух меркаваньняў: адно, што ён з навуковага гледзішча лепей надаецца для выяўленьня выразнасьці гукаў у беларускай мове, а другое, што дзеці нашых эмігрантаў перш-на-перш вывучаюць у школе мову тых народаў, у васяродзьдзі якіх жывуць. А толькі па нейкім часе ў сваіх нядзельных школах ці дома пачынаюць вывучаць сваю родную мову. Пераход ад іншай да роднай мовы будзе шмат лягчэйшым для дзяцей, калі беларускі тэкст чытаньня перадаваць лацінскімі літарамі, якія яны ўжо навучыліся чытаць і пісаць, калі вывучалі іншую мову.

Гэткі парадак навучаньня якраз адпавядае пэдагагічным і мэтадычным патрабаваньням: "Ад блізкага й вядомага да далёкага й невядомага". Бо, на вялікі жаль, большыні нашым дзецям, што апынуліся ў іншамоўным асяродзьдзі, мова гэтага асяродзьдзя, у якой яны вымушаны вучыцца, бывае бліжэйшай і болей вядомай, чымся свая родная мова. І вось тут лацінка спрыяе хутчэйшаму і лягчэйшаму навучаньню роднай мовы, бо ня будзе патрэбы траціць шмат часу на вывучэньне літараў і напісаньне іх. А пазьней, калі дзеці ўжо азнаёмяцца з беларускім тэкстам чытаньня і пісьма, будзе зусім лёгка перайсьці на кірылічны тэкст чытаньня й пісьма. Гэткае вывучэньне будзе складаць суцэльны камплекс з паступовымі паваротамі ад іншай да сваей роднай мовы з усімі ейнымі асаблівасьцямі. Лемантар будзе добра надавацца й для тых дзяцей, якія чужой мовы зусім не вывучалі.

Што да зьместу, дык укладальнік лемантара кіраваўся на фальклёрны й краязнаўчы матар'ял, каб нашы дзеці праз лемантар з дапамогай настаўнікаў і бацькоў маглі вырабіць сабе ўяўленьне аб нашым родным краю.

А а
Аа



А-а-а! А-а-а! А-а-а!


оо ıı аа



U u
Uu

U-a! U-a! U-a!






U-u! U-u! Au-u-u-u!

i i u ua



Mm
Mm

Mama



Mu!



Am!

Ma-ma	mu
ma-mu	am


ı ı ı m mama



Tata

T t
Tt

Ta-ta	tut
ma-ta	tam
ma-ma	am



Mata

Tut tata.

Tam mama.

Tata tut, a mama tam.

t t tata

Y y

Y y




My

Ma-ma	ta-ta	ma-ta
ma-my	ta-ty	ma-ty
my	ty	my-ty

My tut u mamy.
Ty tam u taty.
U taty maty.
My tut, a ty tam.

i ȷ y my



R r

R r


Mury

Ma-ma	ta-ta	mur
ra-ma	Mar-ta	mu-ry
ra-my	ru-ta	try

U mury try ramy.
Tam u mury mama.
U mamy Marta.
U Marty ruta.

r rama

K k
K k



Kury

Ku-ry	ka-ma-ry	ka-ra
ru-ka	kra-ma	kut
ra-ka	Ma-kar	rak
mu-ka	Mar-ka	mak

U mamy kury.
Kurka tam u kutku.
U kutku kamary.
Kurka kamara am.

k kury

S s
S s




Trusy

Sy-ry	ka-sa-ty	sa-ma
ka-sa	kras-ka	sam
ra-sa	smu-tak	kus-ty
sy-ty	mas-ty	tru-sy

Tut sam tata.
U taty try trusy.
Trusy syty.
Tut sama mama.
U mamy syry.

s syry




I i
Ji

Sita

Mi-sa	si-ra-ta	kur-ki
ru-ki	ra-ki-ta	mir-ta
sa-mi	Mak-sim	kry-ki
si-ta	kras-ki	ra-ki

Tut my sami.
U taty sita.
U mamy syr i misa.
U Marty mak i mirta.
U Maksima raki.

i misa



L l
L l

Lis

A-la	ma-ty-li	lul-ka
la-la	Ma-ry-la	lis-ka
lu-la	Klim-ka	kra-li
ku-la	my-li	la-sy

Kala raki lasy.
A tam lisy.
Lisy krali kurak.

A tut Maryla.
U Maryli lalka.
Lalka tut u luli.



l lalka



O o

O o

Kot

Mo-ra	ka-mor-ka	sol
mok-ra	ka-lo-sy	sok
mas-tok	A-lok-sa	mol
ka-tok	ma-tok	tok

U Marty kamorka.
A tam katok.
Katok skok u kutok.
U kutku matylok.



o mora



Ł ł


Ł ł

Łom

Ła-my	ma-ła-ko	ko-ła
my-ła	ka-łys-ka	Mi-ko-ła
ma-ły	ła-ma-ła	kła-li
ła-sy	ma-ło-li	łus-ta

Klim i Maryla łamali suki.
Maksim i Mikoła kłali łamy.
Mikoła mały.
Mama myła Mikołu ruki.

Ł łamy



Młyn

N n
N n

Sa-ni	Nas-tu-la	Ra-man
na-ra	Ma-ry-na	Sy-mon
ra-na	ka-li-na	mły-ny
si-ni	ma-li-na	sy-ny

U Ramana kala raki młyn.
My tam małoli muku.
Raman i tata kłali muku na kalosy.
Kala młynu mastok.
La mastka rasła kalina.

n tut młyn



Š š


Š š

Školа

My-šy	šyš-ki	ka-ša
mu-šu	Ta-maš	na-ša
šnu-ry	Łu-kaš	šmat
šy-ła	šy-ro-ki	šum

Tut naša škoła. Tut našy školniki: Nastula, Łukaš i Tamaš, Maryla, Symon i šmat nas. Kala školy šmat krasak. A tam la tynu šyroki kaštan.

š naša škola



P p

Pp

Parkan

Pi-ła	pas-ma	šap-ka
ła-pa	sna-py	Pi-lip
ka-pa	šyp-šy-na	pył
li-pa	pa-ra-son	tar-pa

Pry taku parkan. La parkanu rasła lipa. Tam ros i kust šypšyny.

Pry taku snapy. Pilip i Aloksa nasili snapy. Snapy kłali na tarpu.

p snapy na taku



E e

E e

Repa

Le-ta	ka-le-na	klet-ka
še-ry	ka-le-ka	Tek-la
a-re	A-le-na	ka-šel
re-ki	re-ša-ta	les

Alena kapała repu. Repu kłali na nošy. Symon i Klimka nasili repu. Tekla nasiła repu starym rešatam. Repu kłali la płotu.

Uletku my nasili repku.

e trus skok u repu



B b

Bb

Bor

Bo-ty	ba-ra-na	bra-ma
bu-ra	ba-bu-la	Ba-rys
bu-rak	Bar-ba-ra	bab-ry
ba-ran	bar̀-suk	bor

U bary było šumna. Tam była bura. Bura łamała les. Nam było strašna.

Kala boru było bałota. A tam i raka. Abapał raki les i kusty. Tam byli babry.

b była bura



H h
H h

Husi

Ha-ra	hry-mo-ta	sta-hi
na-ha	har-ma-ta	Hel-ka
he-ty	Ha-nu-la	ho-man
ho-łas	u-bo-hi	hry-by

Heta našy husi. U nas husak i try huski. Našy husi syty.

— Hanna, hani husi na pašu! —

— Ahila! Ahila! husi, na pašu, — hamaniła Hanna.

h heta našy husi



Dd
Dd


Dom

Doš-ka	da-ro-ha	du-da-ry
dum-ka	pry-ho-da	Da-ni-ła
dob-ra	dra-bi-ny	Da-ro-ta
du-by	pry-sa-dy	To-dar

Heta naš dom. La domu drabiny. Kala domu prysady.

Adam i Daniła nasili doški da domu. Todar i Darota pad-hra-ba-li treski kala domu dy kłali na kalosy.

d nad domam dym



V v

V v

Vały

Va-da	va-ry-va	var-ta
va-ta	vo-ła-va	dre-va
sa-va	va-ro-ty	vir
vo-ła	pad-ko-va	vił-ki

U nas dva vały. Abodva vały na dvare. Vałom davali travy dy pahnali da vady.

Tut na dvare byli drovy. Lavon i Tamaš piłavali drovy. Drovy kłali na dryvotni.

v vały na dvare



J j

Jj

Jalinka

Ja-ma	ja-ha-da	Jan-ka	kraj
jar-mo	ab-ja-va	Ja-kub	moj
jeł-ka	jab-ły-na	Ja-kim	svoj
soj-ka	jab-łyk	klej	ja

Nadyšli Kalady. Jakub i Janka pa - šli da haju. Tam jany našli stroj-nu-ju jalinku dy pryvałakli jaje dadomu. A kali doma jaje prybrali, dyk jana stała pyšnaj jalinkaj.

Pyšnaja jalinka



Z z
Z z z

Kaza

Zi-ma	ła-za	va-zy
za-ra	zu-by	zrok
zvon	vuz-ka	kaz-ka
ma-roz	za-ran-ka	zo-ła-ta

Za zatokaj rasła łaza. Kaza hryzła łazu.

Adam i Jurka rezali łazu. Łazu kłali na vazy dy vazili dadomu. Z łazy plali kašali dy vazili na bazar. Za kašali nabrali šmat hrošy.

Kaza hryzła łazu



Ž ž
Ž ž


Žyta

Ža-by	vo-žy-ki	žal
žu-ki	ža-ło-ba	žvir
sa-ža	žu-ra-vi-ny	žor-ny
na-žy	vu-ža-ki	žy-vy

My prajšli darožku miž žyta. Abapał darožki žali žyta. Žyta kłali na vazy dy vazili na humno. Tam žyta kłali na tarpu.

U hajku za našym žytam žyli vožyki. Jany łavili myšak, žabak i vužak.

Žali žyta



Cebar

C c
C c

Cac-ka	łan-cuh	pša-ni-ca
pa-li-ca	su-ni-ca	cep
pa-cuk	zva-ni-ca	cym-ba-ły
ca-na	son-ca	ma-ci

Maci kupiła Vincuku šmat cacak. Vincukovy cacki na palicy. Tam na palicy j jahonyja cymbały.

U Vincuka było sunic ceły caberak. Mąci sasmažyła tyja sunicy z cukram.

Cacki na palicy



Ch ch

Ch ch

Chata

Mu-cha	stra-cha	ha-roch	su-cha
chma-ra	pas-tuch	chvo-ja	ha-rech
ka-tuch	cha-mut	moch	dach

Naša chata z chvajovaha dreva. Jana budavana z suchim mocham. Jejnaja stracha z pravaj sałomy. Naša chata vidnaja j suchaja. Chlavy j katuchi voddal ad chaty.

Svaja chatka, jak rodnaja matka.

Chata suchaja



Biarozy

Pia-sok	viat-ry	mia-sa
vias-na	mia-ža	nia-su
siab-ra	via-li-ki	mia-ta
siam-ja	ziam-la	bia-da

Na našym dvare rasła vialikaja biaroza. My viasnoj z našaj biarozy spuskali sałodki sok. Na viarchu biarozy było busłava hniazdo.

Hetak kazała Zosia.

Zosia chvaliła biarozu



Siena

Mie-žy	mies-ta	vie-cier
vie-ža	mies-ca	mie-siac
pie-na	cia-cie-ra	bie-ły
cies-ta	pa-cie-cha	siem

Letam my z bratam jechali pa siena. Naš biełу konik bieh pa pylnaj darozie. My pryjechali da kop i nakłali siena na voz. Dadomu my jechali vysaka na vozie na miakkim sienie.

Sieli na sienie



Č č


Č č

Čarnicy

Ča-bor	pa-reč-ki	reč-ka
sa-roč-ka	ča-reš-ni	sieč-ka
čar-viak	čar-ni-cy	čap-la
ple-čy	za-čy-ni	pieč

Uletku vučni mieli adpačynak. Jany praz pole pakročyli da lesu pa jahady. Pole pachnuła hrečkaj i čabarom. U bary doł až čorny ad čarnic. A tam kala rečki čyrvonyja parečki.

Čornyja jahady



Ŭŭ

Ŭŭ

Voŭk

Voŭ-na	ka-roŭ-ka	Saŭ-ka
poŭ-na	ra-doŭ-ka	koŭ-dra
daŭ-na	łas-taŭ-ka	Aŭ-du-la
łaŭ-ka	kni-haŭ-ka	ku-piŭ

Paŭluk pahnaŭ aviečki na pašu. Raptam z jałoŭcu vyskačyŭ voŭk, schapiŭ barana dy paciahnuŭ da lesu. La lesu za kustami byŭ palaŭničy. A kali voŭk prybieh da lesu, dyk palaŭničy zastreliŭ jaho.

Tam vyŭ voŭk



Dziadula

Dz dz


Dz dz

Dzie-ci	dzia-du-la	dzia-cieł
dzi-va	a-dzie-ža	dzia-kuj
lu-dzi	dziaŭ-čy-na	dzi-ki
hla-dzi	dzia-ža	sia-dzi

Dzieci siadzieli ŭ sadzie. Tam prachodziŭ dzied Dzianis. Dziaŭčynka dała dziadulku jabłyčkaŭ i dulak. Dziadulka padziakavaŭ dziaŭčyncy za sadavinu.

Dziady nia mieli biady.
Unuki nabralisia muki.

Dzieci ŭ sadzie



Śś *Śś*
Źź *Źź*
ń *ń*

Łoś

Piat-ruś	kuź-nia	uź-leź	źvier
Kas-tuś	śviń-nia	koń	huś
łaź-nia	pieś-nia	śvi-ran	ścień

Chłopcy paścili koni ŭ lesie.

– Ustańcie j hlańcie. Tam u łaźniaku nieśta kranułasia, – kaža Antoś da siabroŭ.

Chłopcy aściarožna padyšli da łazy, až tam stajaŭ vializny łoś dy źjadaŭ liście z łazy.

Hlań Antoś tam łoś




Vaviorka

Ciop-ła	va-zio-ry	ciot-ka
ciom-na	via-sioł-ka	vios-ka
mio-tły	vios-ły	viod-ry
siost-ry	sio-le-ta	siomy

Sioleta ŭletku my žyli na vioscy ŭ ciotki Lavosi. Było ciopła. My z siostrami pajšli ŭ hryby. Tam u lesie my bačyli maleńkaha ryžaha zviarka. Heta była vaviorka.

Vaviorka na lipie



Ć ć *Ć ć*
Dź dź
Dź dź

Miadźviedź

Śnie-dać	pry-chodź	jość
ćmia-ny	dźvie-ry	złość
miadź-viedź	ćviar-dy	budź
bać-ka	ćvia-ki	hladź

Byli my na načlezie. Ranicaj my mielisia jechać damoŭ, ale koni ad strachu raptam raźbiehlisia. Hladzim, až z łazy vychodzić miadźviedź. Kali jon ubačyŭ nas, dyk viarnuŭsia nazad, bo miadźviedź nia choča spatykacca z ludźmi.

Hetak apaviadaŭ naš baćka.

Miadźviedź uciok



Ziaziula


Dzia-ciuk	niu-chać	ziu-ziu-kać
ma-niu-ka	ciuć-ka	Pa-na-siuk
zia-ziu-la	u-siu-dy	Ka-ziuk

Ziaziula žyvie ŭ lesie. Ziaziula kukuje. Jana padkidaje svaje jaječki ŭ čužyja hniozdy. My časta ziaziulku ŭspaminajem u pieśniach i kazkach.

Dziaŭčaty siadzieli na pryźbie dy j zapieli pieśniu ab ziaziulcy:

— Kukavała ziaziulka ŭ sadočku,
Pryłažyŭšy hałoŭku k listočku...

Ziaziula kukuje



Dž dž
Dž dž

Doždž

Drož-džy	maž-džer	daž-džy
jež-džu	sa-dža-ny	va-džu
cha-džu	hla-džu	vi-džu

My mielisia sadžać kapustu. A ralla suchaja, jak popieł. Raptam najaždžaje čornaja chmara. Stała ciomna. Paliŭsia doždž, jak z łataka. Kali doždž spyniŭsia, dyk my stali sadžać kapustu.

Chadžu pa daždžy

F f

Ff




Flejta

Far-ma	far-ta-pi-ja-na	pa-te-fon
far-mer	fi-ran-ka	te-le-fon
ku-far	kaf-ta-nik	fest

Dzieci pryjechali na farmu. U pakoji farmera na voknach firanki. U kutku stajaŭ kufar. A pry ścianie byŭ telefon.

U druhim pakoji dačka farmera jihrała na fartapijanie. Na dvare pad lipami syn farmera jihraŭ na flejcie.

Na voknach firanki.



G g

Gg


Cegła

Gon-ty	gru-ca	ga-nak
maz-gi	A-ga-ta	gu-zik
roz-gi	ga-za	gu-zy

Rupny haspadar Gabruś. Jon žyvie ŭ vioscy, a vymuravaŭ sabie chatu z cegły dy nakryŭ jaje gontami. Da chaty prystrojiŭ zgrabny ganak.

Babula Agata, maci Gabrusia, časami taŭče grucu ŭ stupie. Jana kaža, što toŭčanaja gruca pažyŭniej za młynavuju.

Ganak vysoki



Katok

Luli, luli, luli!
Palez kot pa duli.
Pamaroziŭ łapki,
Palez na pałatki.
Stali łapki hrecca.
Niedzie katku dziecca.
Palez-by dałoŭki,
Bajicca karoŭki.
Palez-by jon vyšej,
Dyk bajicca myšaŭ...
Tam myški dureli,
Katku chvost adjeli...
Z pałatak zvaliŭsia
Dy na śmierć zabiŭsia.

ALFABET — ŁACINKA

Aa Bb Cc Ćć Čč Dd

Ee Ff Gg Hh Ch ch

Ii Jj Kk Ll Łł Mm

Nn Ńń Oo Pp Rr

Ss Śś Šš Tt Uu Ŭŭ

Vv Yy Zz Dzdz Żż

Dżdż Žž Dždž

Aa Bb Cc Ćć Čč Dd

Ee Ff Gg Hh Ch ch

Ii Jj Kk Ll Łł Mm

Nn Ńń Oo Pp Rr Ss

Śś Šš Tt Uu Ŭŭ Vv

Yy Zz Dz dz Źź Dź

dź Žž Dž dž



1 2 3 4 5 6 7 8 9 0

1 2 3 4 5 6 7 8 9 0



KURY

Luli, luli, luli!
Prylacieli kury,
Sieli na varotach,
U čyrvonych botach.
Stali sakataci,
Što kuračkam daci:
Ci žyta karyta?
Ci jačmieniu žmieniu?
Ci harochu trochu?
Ci bobu karobu?
Treba daci hrečki,
Kab niaśli jaječki.

KURKA

Byli žyli dziedka dy babka. Była ŭ jich kurka rabka. Naniesła jajec poŭny karabiec. Dzied jaječka biŭ, biŭ - nie raźbiŭ. Babka biła, biła - nie raźbiła. Myška biehła, chvastočkam machnuła dy j pabiła ŭsie jaječki.

Dziedka płača, babka płača, kury kudakčuć, sabaki brešuć, varoty skrypiać, ludzi hamaniać.

KATOK SAM CIAHNIE

Kaža maci da svaje maleńkaj dačuški:
— Hanulka, navošta ty ciahnieš katka za chvastok? Heta-ž jamu balić.

— Ja, mamačka, nie ciahnu, a tolki trymaju katka za chvastok, a katok sam ciahnie, — adkazała dziaŭčynka.

AŁADKI

Ładu, ładu ładki!
Pajeŭ kot aładki:
Pšonnyja, jačnyja,
Jany byli smačnyja,
Aržanyja, pałavyja,
Babovyja hatovyja.

KAZKA

— Mama, ci lubiš ty słuchać kazki? — pytajecca dziaŭčynka.

— A jak-ža, maja dzietačka, lublu!

— A ci chočaš, kab ja tabie raskazała kazku?

— Dobra, raskažy, a ja pasłuchaju.

— A ci spadabajecca jana tabie? — dapytvajecca dziaŭčynka.

— Napeŭna spadabajecca, — adkazała maci.

— Ale jana vielmi karocieńkaja...

Nu, kažy-ž užo! —

— Dobra! — kaža dziaŭčynka. —Była raz u nas palivanaja misačka, a ja stała jaje myć dy j pabiła...

VARONA-SAROKA

Varona-saroka
Na prypiečku siadzieła,
Dzietkam kašku varyła,
Apałonikam miašała,
Spytavać davała.
Hetamu dam
I hetamu dam,
A henamu nia dam,
Bo jon hultaj:
Krup nia draŭ,
Vady nie nasiŭ,
U piečy nie paliŭ,
Kašy nie varyŭ.
Jamu łyžka na palicy,
Jamu kaška ŭ čarapicy.

JANAČKA

Matka piakła ranicaj aładki, a maleńki Janačka krucicca kala jaje. Matka nie zvažała na jaho, bo času nia było. A Janačka j kaža da matki:

— Mama, čamu ty sa mnoj nie havoryš? —

— A što-ž ja budu z taboj havaryć? — pytaje matka.

— A voś choć-by skazała: "Na, tabie, Janačka, aładačku".

SYNOK

Maci syna radziła,
Na konika sadziła.
  Cyle, kosie, da vady.
  Šaŭkovyja pavady.
Konik nie nahnuŭsia,
Synok ulaknuŭsia.
  Konik nie napiŭsia,
  A synok zvaliŭsia.

Naša siamja

Dobra mnie žyć u rodnaj chacie, dzie žyvuć maje — mama j tata, braty j siostry. Tata haspadar siamji, jon pracuje na nas, my ŭsie jaho słuchajem. Mama pracuje ŭ chacie. Mama rupicca, kab usia siamja była ŭ svaju paru nakormlena, kab była adzieta j dahledžana. Tata j mama lubiać nas, a my lubim jich.

Łasačka

— Łasačka, łasačka, dzie była?
— U Boha!
— A što rabiła?
— Chatku miała!
— A što zarabiła?
— Piražok!
— Dzie ty dzieła?
— Sama źjeła!

Naša babulka

Naša babulka dobraja j viasiołaja. Kali jana kałyša małuju Zośku, dyk piaje nad kałyskaj pryhožyja j viasiołyja pieśni. My hetyja pieśni navučylisia j časta piajom jich.

Kali babulka z svajim vieraciencam siadzić na praśnicy, dyk apaviadaje nam roznyja cikavyja kazki. My šmat hetych kazak navučylisia dy navat raskazvajem svajim siabrom.

SAROKA

— Ga-ga! — varona.
— Čy-čy! — saroka.
— Dzie ty była daloka?
— Była ŭ pana na taku.
— A što rabiła?
— Tałaku.
— A što zarabiła?
— Kusok sała.
— Dzie ty dzieła?
— Sama źjeła.

Chitraja kaŭka

Daviedałasia kaŭka, što hałuboŭ dobra kormiać. Jana vybieliłasia dy palacieła da hałuboŭ. Tam siarod hałuboŭ jana zakryčeła pasvojmu. Hałuby prahnali jaje. Tady jana palacieła nazad da svajich kavak. Kali kaŭki

ŭbačyli, što jana biełaja, dyk pačali jaje bić i prahnali jaje ad siabie. Heta chitraja kaŭka prymušana była zastacca sama adna.

UPARTYJA KAZIELKI

Adzin kazielka byŭ za rečkaj. Jon tam najeŭsia maładzieńkaj travicy dy varočaŭsia damoŭ, kab adpačyć. Druhi hetki samy kazielka byŭ doma dy bieh za rečku ŭ hajok, kab pałasavacca maładzieńkaj śviežaj travicaj.

Abodva hetyja kazielki spatkalisia na vuzieńkaj kładcy nad rečkaj. Nivodzin kazielka nie chacieŭ sastupić z darohi, kab puścić prajści svajho siabru, a potym i samomu prajści. Jany stali baścisia dy abodva zvalilisia ŭ vadu.

K A Z I O Ł

Byŭ u babki
Sivieńki kozle.
Jon na stajency stajaŭ,
Jon apolinki smaktaŭ.
Dy pajšoŭ toj kazioł
U les pahulaci,
Dy pa jelničku,
Pa biareźničku...
Adzin vaŭčok,
Ablezły bačok,
Siem hod lažaŭ,

Kaźlinki žadaŭ...
— Pastoj, koźle,
Pabarokajemsia...
Dy jak voźmie za rožki,
Dy jak kinie ab doški,
Jak voźmie za chvastok,
Dy jak kinie ab mastok...
Pryšli k babcy
Smutnyja vieści:
— Ustavaj, babka,
Dy pali piečku,
Dy vary kašku,
Paminaj kazła...
— Ci nia kožle byŭ?
Ci nia sivieńki?
Jon i droŭcy vaziŭ.
Jon i piečku paliŭ,
Jon vadzicu nasiŭ,
Jon i kašku varyŭ. —

DZIED I CHŁOPCY

Dzied sadziŭ u sadzie jabłynku. Pryšli chłopcy, pabačyli staroha dy j kažuć jamu:

— Navošta tabie heta jabłynka? Ty ŭžo stary, a jej doŭha raści treba, dyk tabie nie daviadziecca pakaštavać z jaje jabłykaŭ. —

— Nia ŭsio-ž tolki dla siabie rabić. Kali ja nie pakaštuju jabłykaŭ z hetaj jabłynki, dyk niechta jinšy pakaštuje, a mnie dziakuj skaža, — adkazaŭ dzied.

MOJ KONIK

Pa dalinie na łužočku
Jeździć ja lublu.
Ja z dubovaha kijočka
Konika zrablu.
Hajda, hajda, bułanieńki,
Až u ciomny bor!
I lacić kijok moj cieńki
Prosta, jak vichor.

Sabaka

Bieh sabaka pa kładcy praz rečku, i ŭ zubach nios jon kavałak miasa. Ubačyŭ jon siabie ŭ vadzie j dumaŭ, što heta jinšy sabaka niasie miasa. Jon vypuściŭ z zuboŭ svajo miasa, dy kinuŭsia adbirać miasa ŭ taho sabaki, jakoha bačyŭ u vadzie. Tam u vadzie nikoha nia było, a jahonaje miasa pajšło na dno raki,

DVA PŁUHI

Z adnolkavaha zialeza kaval vykavaŭ dva płuhi. Adzin hety płuh kupiŭ haspadar. Jon hetym płuham araŭ pole. Ad štodziennaj pracy hety płuh adšlifavaŭsia j bliščeŭ, jak srebra. Druhi hety płuh lažaŭ na daždžy ŭ brudzie. Jon uvieś zaržavieŭ i byŭ niapryhožy j słaby.

Hety płuh, što lažaŭ biaz pracy, ubačyŭ svajho siabru j pytaje:

— Jak heta, ty hetki bliskučy j mocny, a ja jiržavy j słaby? —

— Ja pracuju, a praca dadaje mnie blasku j mocy, — adkazaŭ pieršy płuh.

B A J

Jišoŭ baj pa ścianie
U čyrvonym županie.
Pluščyŭ vočki dzietkam jon,
Naviavaŭ jim cichi son.
Dy pieŭ pieśni dzieciam baj:
— Baju baju,baju,baj! —

Z A J A C

Na poli pry hajku žyŭ sabie zajčyk. Jon nikomu nie rabiŭ škody, nikoha nie pakryŭdziŭ, ale ŭsich bajaŭsia, ad usich uciakaŭ.

Za zajcami palaŭničyja z hančakami cikujuć. Voŭk i lis starajucca pałasavacca zajcavym miasam. Roznyja jastraby j sovy źniščajuć zajcaŭ.

Adnaho razu hety zajčyk staŭ sumavać i narakać na svoj los:

— Ja ŭsich bajusia, ja ad usich uciakaju, dy chavajusia. Niama na śviecie takoha stvareńnia, kab mianie bajałasia. Mnie ničoha nie zastajecca, jak pajści dy ŭtapicca. —

Płača zajčyk dy biažyć da rečki tapicca.

Ale jak uzarviecca žaba ŭ jaho z-pad noh dy boŭć u rečku.

Zajčyk śpiarša spałochaŭsia, a potym zaśmiajaŭsia dy viarnuŭsia nazad da svajho hajka. Jon uściešyŭsia, što znajšłosia na śviecie choć adno stvareńnie, jakoje jaho spužałasia.

MANIUKA

Chłopčyk paściŭ aviečki j, byccam ubačyŭšy vaŭka, pačaŭ kryčeć:

— Aha, aha! Vaŭki, vaŭki! —

Sialanie tut blizka arali j prybiehli na ratunak, a chłopčyk śmiajecca, što padmaniŭ jich.

Nieŭzabavie sapraŭdy prybieh voŭk. Chłopiec pačaŭ kryčeć:

— Voŭk, voŭk! Siudy, siudy chutčej. Pamažycie! —

Sialanie dumali, što chłopčyk jiznoŭ manić jich i nia pryšli na ratunak.

Voŭk bača, što pastušok mały, bajacca niama kaho. Jon schapiŭ aviečku dy j panios u les.

PIEŚNIA NAD KAŁYSKAJ

Aa-aa, moj synok!
Aa-aa, miły!
Nia kryčy, nia płač: daremna
Ty patraciš siły;

A biaz siły, moj synok,
Žyć na śviecie trudna...
Oj ty, viecier, nia šumi,
Nie śpiavaj tak nudna!
Spać Michaśku nie daješ...
Śpi, moj syn maleńki!
Ja ciabie pakałyšu —
Aj, luli — luleńki!
Aa-aa, moj synok!
Aa-aa, miły!
Oj, nia płač ty, nia kryčy,
Nabirajsia siły!

DOBRY SYNOK

Chłopčyk bieh pa vulicy dy papaŭsia pad samachod. Koła pierałamała jamu nahu. Niesčaśliŭca prynieśli damoŭ.

Paklikili doktara. Doktar vyciahvaŭ pałamanuju nahu, kab vyraŭnavać, dy ŭviazvaŭ jaje. Chłopčyk, ścisnuŭšy zuby, ciarpieŭ usio heta. Spakojnaść chłopčyka ździviła doktara j jon zapytaŭsia:

— Ci tabie nie balić? čamu ty hetak spakojna trymaješ siabie? —

— Mnie j nadta balić, — kaža chłopčyk, — ale ja ciarplu, bo ŭ druhim pakoji lažyć maja chvoraja mama. Kali ja budu płakać i kryčeć, dyk jaje apanuje žal, i jana jašče horaj zachvareje. A ja ciarplu, bo škaduju svaju mamu.—

VAVIORKA J VOŬK

Voŭk, najeŭšysia, spaŭ u lesie pad drevam. Vaviorka pa drevie skakała z sučka na sučok, i zvaliłasia na vaŭka. Voŭk chacieŭ jaje źjeści. Ale vaviorka pačała prasicca:

— Puści mianie. —

Voŭk skazaŭ:

— Dobra, ja pušču ciabie, ale ty skažy mnie čamu vy vaviorki zaŭsiody hetkija viasiołyja j šustryja, a my vaŭki złosnyja j panuryja? —

Vaviorka jamu adkazała:

— Pierš adpuści mianie na dreva, dyk ja skažu tabie, ato ja bajusia ciabie. —

Voŭk nia byŭ hałodny, dyk puściŭ jaje. Vaviorka skoknuła na dreva j pramoviła:

— Vy vaŭki zaŭsiody panuryja j złosnyja, bo złość vam serca pierajeła. My zaŭsiody viasiołyja j šustryja, bo my nikoli nikomu nia robim škody. —

Našy ptuški

Vierabiejka piaje viasnoj:
Žyŭ-žyŭ-žyŭ!
Zimku pieražyŭ!
A ŭ chatcy nia byŭ!
Žyŭ-žyŭ-žyŭ!

Žavaranka piaje, kali prylacić z vyraju:
Dzieci, dzieci, bicie śnieh!
Kijem, kijem, kijem, kijem!

Łastaŭka piaje, kali prylacić z vyraju:

(Da haspadara)

Niasi, niasi nie trasi,
Bo jašče źjasi!
Pakinuła paŭniusieńka!
A zastała puściusieńka!
Pierapili, pierajeli,
Pierałasavali!

(Da dziaŭčat)

Zimkaj nočki pozna spali
Nie paprali, nie patkali,
Pad lod kłački papuskali.

(Da pastuška)

A nichto nie taki,
Jak pastuch praklaty!
Doma žare, z saboj biare,
A pryšoŭšy damoŭ,
Jašče j płača!

Pierapiołka piaje viasnoj u žycie:
Voś viadzieć, niehdzie dzieć!
Voś biada biez chlava!

Drač piaje nočču ŭ travie:
Drač-drač! Loh spać!
Pad pniom! Karčom!

Varona piaje, kivajučysia na kałku:
Ukraŭ! Ukraŭ! Ukraŭ! Ukraŭ!
Ziaziulka piaje vysaka na drevie:
Kupiŭ! Kupiŭ! Kupiŭ! Kupiŭ!

USPAMIN DZIACIEJ EMIHRANTA

Naša chata

Chata naša novaja j vialikaja. U chacie stoł dubovy, a łavy šyrokija žoŭtyja z smołnaj sosny. Vokny vialikija j śvietłyja, zaviešanyja firankami. Na voknach stajać vazony. Na stale my časta stavim bukiety z pachniučych kvietak.

Naša chata zaŭsiody dahledžana j prybrana: padmieciena, pył vycierty, padłoha pamyta. Łožki pazaściłany samatkanymi dyvanami ŭ pryhožyja vuzory. U našaj chacie pryhoža j utulna.

Naš harodčyk

Ad vulicy pierad našaj chataj zrobleny harodčyk dla kvietak. Tam usiaho jość šmat. Tam jość i biełу j sini bez i jaźmiń. Tam jość ruža — i ružovaja, i biełaja, i čyrvonaja. Z druhoha boku harodčyka pasadžany pa kustu — čaremchi, šypšyny, kaliny, vierbałozu dy jałoŭcu.

Pasiarod harodčyka klumby, na jakich raście biełaja j čyrvonaja pivonija j laleja, a he-

tak sama ruta, miata, pachniučyja ramońki j nahodki. Pad kaniec leta tut pačynajuć raśćvitać hvaździki, nasturcyja dy roznakalarovyja astry. Pa kutkach harodčyka siadziać sakavityja kusty virgini z taŭstymi kviatami. U kutočku harodčyka pad vuhłom chaty siadzić kust našaha spradviečnaha dzivasiłu.

Naš sadok

Miž panadvorkam i humnom u nas pasadžany sadok. Tam jość jabłyny, jihrušy, višni j ślivy. Na ŭźmiežku kusty agrestu, parečak i malin. Z paŭnočnaha boku sadka rastuć pryhožyja lipy.

Ja lublu svoj sadok nia tolki za heta,što ŭ jim jość jabłyki, jihrušy, višni, ślivy dy jahady, ale ja jaho lublu jašče j za toje, što ŭ jim viesieła j pryjemna. Asabliva choraša ŭ našym sadku viasnoj, kali ŭsie drevy pakryty biełym pachniučym ćvietam. Na ŭźmiežkach ranicaj bliščyć rasica. Siudy časta ranicami prylataje j piaje sałaviej.

U našym sadku stajić vosiem vullaŭ z pčołami. Ja lublu ŭ śpieku lehčy pad parečkavym kustočkam i pazirać, jak pracavityja pčołki nosiać miadok u svoj vulej.

U NAČY

Nad kałyskaj matka
Nočku karataje,
Chvoraha synočka
Ciešyć zabaŭlaje.
Na ćviačku paviešan
Načničok ubohi.
Paziraje ŭ vokny
Miesiačyk dvurohi.
Karahody zorak
Uhary mihajuć,
Na ziamli śniažynki
Sinim blaskam źziajuć.
Tak spakojna ŭsiudy,
I takaja ciša!
Chvoraje dziciatka
Tak nia roŭna dyša, —
Zabivaje kašal,
Nie daje spakoju.

* * * *

Śpi, majo dziciatka!
Śpi, majo luboje!
Nia pužajsia miły!
Boh śviaty z taboju...
Von pajšoŭ ty z chaty,
Sivy dzied z kulboju!
Vun pajšoŭ dzied sivy,
Kryvicca i płača...

Uciakaj adhetul.
    Uciakaj, biadača!
Voś jaki dzied hety —
    Dumaŭ napałochać!
Budzieš usiu nočku
    Na marozie vochać!
A nie chadzi ŭ chatu,
    A nia leź ślapicaj!...
Płač ciapier i mierźni
    Dy nia budź durnicaj...

* * * *

O, Piatruś moj caca!
    Lubim my Piatrusia:
Lubić jaho tata,
    Lubić i matusia.
Kupić tata Piotru
    Bociki na nožki,
Pojdzie moj synočak
    Prakładać darožki!
Novuju kašulku
    Ja tabie pašyju,
U vadzicy ciopłaj
    Čyścieńka pamyju.
Budzieš ty charošy!
    Ciotka nie paznaje,
"A čyj heta chłopčyk?"
    Dziadźka zapytaje.
Usie dzivicca stanuć
    I chvalić Piatrusia.
— Heta —ja, — ty skažaš: —
    Ja — synok Gabrusiaŭ...

Lis i žoraŭ

1) Krupnik

Niejak raz pasiabravali miž saboj lis i žoraŭ. Lis zaprasiŭ u hości žorava dy naliŭ jamu smačnaha krupniku na płytkuju talerku.

Stukaŭ, stukaŭ žoraŭ svajej doŭhaj dziubaj pa płytkaj talercy, a ŭ rot ničoha nie dastałosia. A lis u hety čas prysnaściŭsia, dy źlizaŭ uvieś hety krupnik dy j chvalić svaju stravu:
— Voś dyk smačna! Voś ja rad, što pačastavaŭ ciabie hetkaj smačnaj stravaj. —

2) Piva

Na druhi dzień žoraŭ zaprasiŭ lisa ŭ hości. Jon navaryŭ smačnaha piva z miodu dy naliŭ jaho ŭ hładyšyk. Sam jon pje hetaje piva svajej doŭhaj dziubaj dy j prosie lisa:

— Kali łaska, častujsia, susiedzie! —



A lis ablizvaje źvierchu hety hładyšyk, bo jahonaja myza nia lezie ŭ vuzki hładyšyk.
Sam žoraŭ vypiŭ heta piva dy j kryčyć:
— Dabro piva! Dabro piva!...

3) Ptušaniaty

— Dziakuju za piva! — kaža lis. — Ale ja chacieŭ-by miasa pakaštavać. Kali łaska, susiedzie, pašukaj mnie hniozdaŭ z ptušaniatami. —

— Vun, bač, u lesie na drevach poŭna ptušynych hniozdaŭ, — kaža žoraŭ. — Sadzisia mnie na plečy, dyk ja ciabie padymu da hniozdaŭ i ty tam budzieš vybirać ptušaniat, jakich sabie zachočaš. —

Lis sieŭ žoravu na plečy, i žoraŭ padniaŭ jaho až pad samyja chmary. U lisa ad strachu paciamnieła ŭ vačoch, dy j duch jamu zaniało. Lis nia ŭtrymaŭsia na plačoch u žorava dy j palacieŭ dałoŭ. A žoraŭ kryčyć na lisa:
— Kirujsia! Kirujsia! Kirujsia!...
Ale lis, padajučy dałoŭ, užo nia moh kiravacca na hniazdo, a valiŭsia prosta na doł, dy jak udaryŭsia ab pień, dyk i zabiŭsia.

MIADŹVIEDŹ I SIELANIN

1) Repa

Całuju zimu miadźviedź spaŭ u svajim łahvie. Kali viasnoj pračchnuŭsia j vylez z svajho łahva, dyk ubačyŭ, što niedaloka jahonaha łahva raściarebleny les, i čałaviek are pasieku. Miadźviedź pytaje:

— Našto ty, čałavieča, les pasiek, dy ziamlu areš? —

— Budu repu siejać, — kaža čałaviek.

— Dobra, siej, — kaža miadźviedź. — Ale jak my dzialić budziem? —

— A jak sabie chočaš, — adkazvaje čałaviek.

— Mnie buduć viarchi, a tabie karani, — kaža miadźviedź.

— Dobra! — skazaŭ čałaviek.

Pasiejaŭ čałaviek repu. Repa vyrasła vialikaja sakaŭnaja, smačnaja. Pad vosień čałaviek vykapaŭ repu. Jon nacinu abrezaŭ i pakinuŭ u lesie dla miadźviedzia, a repu zabraŭ damoŭ.

Miadźviedź paciahaŭ hetu nacinu da svajho łahva dy jeść jaje, kab da zimy naješci łoju, bo sytamu lahčej budzie zimu pieraspać. Paroju ŭ nacinie papadziecca maleńkaja repka, dyk miadźviedź źješć jaje sa smakam, ablizvajecca dy złuje na čałavieka, što ašukaŭ jaho.

2) Mak

Na druhuju viasnu pračchnuŭsia miadźviedź i vylez z svajho łahva, až bača, što jiznoŭ čałaviek are tuju samuju ziamlu. Jon i pytaje:

— A što ty, čałavieča, siejać budzieš? —

— Mak, — adkazvaje čałaviek.

— Sioleta, čałavieča, ty mianie nie ašukaješ! Sioleta ŭžo mnie buduć karani, a tabie viarchi, — kaža miadźviedź.

— Dobra! — kaža čałaviek.

Vyras dobry mak. Pad vosień sabraŭ čałaviek mak. Makoŭki siarpom paadrazaŭ dy zabraŭ damoŭ, a makoŭje złažyŭ u kuču dy

pakinuŭ miadźviedziu. Miadźviedź pasprabavaŭ jeści heta makoŭje, až jano ćviardoje j horkaje. Jon sa złości paraśkidaŭ toje makoŭje dy chudy j hałodny loh na zimu ŭ svajo łahvo.

3) Pšanica


Na treciuju viasnu pračchņuŭsia miadźviedź dy chudy j hałodny vylez z svajho łahva, až bača, što jiznoŭ čałaviek na tym samym miejscy are. Jon i pytaje:

— A što ty budzieš siejać, čałavieča? —

— Pšanicu! — adkazaŭ čałaviek.

— Ty, čałavieča, dva razy mianie ašukaŭ, a ciapier užo nie ašukaješ, bo jak tolki ty pasieješ pšanicu, dyk ja ciabie źjem, — skazaŭ miadźviedź.

Miadźviedź uźlez na kalosy, loh tam i čakaje pakul čałaviek pasieje pšanicu, kab tady jaho źješci.



4) Kałoda abharełaja

Miadźviedź bača, što da jich biažyč lis. Jon cicha šepča sielaninu:

— Kali lis budzie pytacca ŭ ciabie: "A što heta ŭ ciabie lažyć na vozie?" — dyk ty jamu adkažy: "Kałoda abharełaja!" —

Padbiahaje lis i pytaje ŭ sielanina:
— A što ŭ ciabie , čałavieča, ležyć na vozie?
— Kałoda abharełaja! — kaža sielanin.
— Kali-b heta była abharełaja kałoda, dykby jana była pryviazana viaroŭkami da voza, — skazaŭ lis dy pabieh ŭ les.
— Pryviažy mianie, čałavieča, viaroŭkami da voza! — šepča miadźviedź čałavieku.
Pryviazaŭ čałaviek miadźviedzia viaroŭkami da voza, a sam pajšoŭ arać.
Prybiahaje lis dy jiznoŭ pytaje:
— A što heta ŭ ciabie, čałavieča, ležyć na vozie, pryviazanaje viaroŭkami? —



— Kałoda abharełaja! — adkazvaje čałaviek.
— Kali-b heta była abharełaja kałoda, dykby ŭ jaje była ŭbita siakiera, — skazaŭ lis dy pabieh u les.
— Ubi ŭ mianie siakieru, čałavieča! — šepča miadźviedź čałavieku.
Uziaŭ čałaviek siakieru, dy jak siekanie miadźviedziu pa hałavie, dyk i zasiek.



Альфабэт-кірыліца

Аа Бб Вв Гг Ґґ Дд

Аа Бб Вв Гг Ґґ Дд

Ее Ёё Жж Дж дж Зз

Ее Ёё Жж Дж дж Зз

Дз дз Іій Кк Лл Мм

Дз дз Іій Кк Лл Мм

Нн Оо Пп Рр Сс Тт

Нн Оо Пп Рр Сс Тт

Уу Ўў Фф Хх Цц Чч

Уу Ўў Фф Хх Цц Чч

Шш ы ь Ээ Юю Яя

Шш ы ь Ээ Юю Яя

Параўнаньне кірыліцы з лацінкай

а - a	і - i	ў - ŭ
б - b	й - j	ф - f
в - v	к - k	х - ch
г - h	л - ł, l	ц - c
ґ - g	м - m	ч - č
д - d	н - n	ш - š
е - je, (i)e	о - o	ы - y
ё - jo, (i)o	п - p	э - e
ж - ž	р - r	ю - ju, (i)u
дж - dž	с - s	я - ja, (i)a
з - z	т - t	ь - (′)
дз - dz	у - u	‘ - ‘





ПРАКТЫКАВАНЬНІ

1—а э о у ы

За-ра	доб-ра	ма-ла-ды
ка-за	дым-на	жа-лу-ды
ва-га	шап-ка	ха-ла-ды
на-га	Ра-ман	ма-ла-ко
са-ла	дуд-ка	ра-бо-та

У таты новы кажух.
Тут рэчка, а там паша.
Наш тата арэ. Мама рэжа рэпу.
Наш Лыска сыты.
У Барбары брат Барыс.

Наш кот сыты.

2—і

Са-ні	ка-сі	ко-ні	тру-сі-кі
пі-ла	ві-лі	пі-шы	ву-сі-кі
сі-ла	ру-кі	пі-ра-гі	ку-пі-лі

Тамаш піша тату ліст.
У Зосі сіні кафтанік.
Галіна мыла ногі. Мы чыталі.
Наша мама лавіла рой.
За нашай хатай расла ліпа.

Гэты шалік сіні.

3—я

Вяс-на	дзя-га	дзя-куй
вяс-ло	зям-ля	бя-ро-за
вяд-ро	у-зяў	бя-ліз-на

Я-ма	ма-я	Ян-ка	яб-лы-на
я-на	яй-кі	Я-куб	доб-ра-я

Ля варот ужо стаялі санкі.
Янка і Зося гулялі дома.
Каля хаты расла бяроза.
У нас салодкія яблыкі.

Пятрок злавіў яшчарку.
Марына мяла хату.

Янка сячэ вяз.

4—е

Лес	печ	се-на	А-ле-на
ле-та	пе-на	се-лі	за-ме-на
ме-жы	пе-лі	сет-ка	ве-се-ла

Ем	е-жа	чу-е	па-е-лі
е-ду	е-ла	ел-кі	е-ха-лі

Мы ехалі лесам.
У лесе шумелі асіны й ліпы.
У нашым лесе жылі ваўкі.
Валя нясе вянок і пяе.
У Рыгора белы голуб.

Дзеці елі кашу.

5 — ь

Буль-ба	Ан-тось	во-сень
пе-вень	Пят-русь	ба-буль-ка
гуль-ні	Воль-га	сьпя-ва-лі
лось	ляль-ка	ель-нік

Годзе, годзе, дзеткі, спаць.
Міхась, Міхась, лаві шапку.
Марыля зьбірала шчаўе.
Міхась і Алесь езьдзілі конна.
У Антося чорны конь.

Антось езьдзіў у лес

6 — ё

Мёд	вёз	клён	цёп-ла
лёд	нёс	ця-лё	вёс-ка
лён	лёг	яг-нё	ка-зёл

Ён	сва-ё	тва-ё	ма-ёў-ка
ма-ё	чы-ё	ём-ка	зна-ё-мы

У мяне ёсьць сшыткі.
Сымон павёў кароўку.
Мае сёстры: Дарота й Ганна.
Сем дзён маладзён.
Гэта наша вёска.
Які добры лён у нашай цёткі.

Ён жыў у вёсцы.

7 — ю

Сю-ды	дзю-ба	ма-ню-ка
лю-дзі	люль-ка	зя-зю-ля
лю-ты	ню-хаць	усю-ды

Шы-ю	Юль-ка	ма-лю-юць
се-ю	Юр-ка	бу-ду-юць
Ю-зік	чы-та-ю	гу-ля-ю

Люлі-люлі, прыляцелі куры.
Юрка й Юля будуюць дамок.
Наста шыла кашулю.

Нашы вучні гадуюць трусоў.
Тата купіў новую кадушку.
Нашы людзі на полі.

Юрка згубіў ключ.

8 — ʼ

П'ю	сям'я	куп'е	ве-раб'і
б'ю	Юр'е	пад'еў	із-рэб'е
аб'еў	пер'е	аб'я-ва	Мар'я-на

Зье-лі	зья-ва	зьезд	зье-хаць

Наляцелі вераб'і
На бабіны канаплі.
А я таму вераб'ю
Кіем нагу пераб'ю.
А на тую ножку
Надзену панчошку.

Наша сям'я п'е каву.

МАМА

Зосьцы было пяць гадкоў. Аднаго разу мама пашла на рынак ды ўзяла з сабой Зоську.

Зоська на рынку заблудзіла. Пачала яна плакаць. Абступілі яе людзі.

— Чыя-ж ты, дзяўчынка? — пытаюць людзі. Зоська маўчыць, бо ня ведае.

— А як завецца твая мама?

— Ня ведаю, — кажа Зоська.

— А якая-ж твая мама? — пытаюць яе.

— Мая мама лепшая за ўсіх, — адказала яна.

У КУХНІ

Гэй, гэй, гоцкі, гоцкі!
Заскакалі ў гаршку клёцкі.
Ой, ня ліха ім жадаці,
Калі хочуць пагуляці.
Гэй, шугі, шугі, — вось так!
Пашлі ў танцы ступа й гляк,
А таўкач узяўся ў бокі
Ды з качалкай пачаў скокі.
Пашоў венік з качарэжкай,
Апалонік з тоўстай дзежкай.
А місачка з гладышком,
Бляха йграе: Дзылін-бом!

МЫШКА

Мышка вылезла з сваей норкі ды ўбачыла пастку. Яна падумала:

— Вось якія хітрыя гэтыя людзі. Яны паставілі пастку, паклалі ў яе падсмажанае сала ды дума-

юць мяне абхітрыць. Я добра ведаю, што толькі дакраніся да гэтага сала, дык дошка ўпадзе ды мяне заб'е. —

Вабіць сала мышку. Яна падыходзіць усё бліжэй і бліжэй.

— Кратаць-жа ня можна, а панюхаць, дык можна, — думае мышка. Яна выцягнула сваё пыскі, каб добра панюхаць. Але зьнячэйку дакранулася да сала. Дошка ўпала дый забіла мышку.

ВОЎК І САБАКА

Неяк раз пасябравалі сабака з ваўком. І сабака запрасіў ваўка ў госьці.

— Як-жа табе жывецца? — пытае воўк .

— А нічагусенькі, добра, — адказаў сабака. — Яды хапае, сяды-тады й костачка дастанецца. Гаспадар мяне ня б'е, не выганяе. Можна жыць. Прыходзь да мяне. Разам будзе весялей. —

— А што гэта ў цябе на шыі? Нейкія плямкі? — пытае воўк.

— Гэта ад ланцуга поўсьць трохі выцерлася,— адказвае сабака.

— Ад ланцуга? Дык бывай здароў. Я не хачу ні тваіх костачак, ні ланцуга. —

Воўк утуліў хвост ды ходу ў лес.

ПЕВЕНЬ

Па надворку певень ходзіць,
За сабою куры водзіць
І крычыць: — Сюды, сюды!

Як кіўне ён галавою —
Сыплюць куры грамадою,
Як адна бягуць туды.
Калі-ж куры хто пужае,
Певень грозна загукае:
— Хто такі там? Хто такі?
Вось у сьвіран ён падаўся.
— Кыш! — адтуль хтось абазваўся.
— Хто такі тут? Хто такі?
Певён курачак частуе,
Гаспадара, бы ня чуе,
Кліча іх: — Сюды, сюды!
Гаспадар мятлу хапае, —
Гвалт наш певень падымае:
— Хто куды! Ой, хто куды!

ВОЎК І КРУМКАЧ

Аднаго разу воўк і крумкач сілкаваліся здохлай каняцінай. Воўк удавіўся костачкай. Яна засела яму ў глытаўцы. Ляжыць воўк, разявіўшы ляпу, адкінуўшы галаву й хвост, ды чакае канца. Убачыў гэта крумкач і кінуўся ваўку на дапамогу. Ён усунуў сваю галаву ў воўчую ляпу ды сваёй моцнай дзюбай выцягнуў з глытаўкі костку. Воўк ачуняў.

Неяк раз зноў зышліся воўк з крумкачом. Крумкач успомніў ваўку, што ён некалі зрабіў яму вялікую ласку, калі выратаваў яму жыцьцё.

— Ты яшчэ важышся ўспамінаць мне аб сваю ласку? — кажа воўк. — Ты-ж тады з галавой быў ня толькі ў маіх зубох, але й у глытаўцы. Калі-б я тады сьцяў зубы, дык твае вочы ўжо болей не

аглядалі-б сьвету, а язык не плявузґаў-бы гэткай брыды. Каб ты мне служыў увесь свой доўгі век, дык ня змог-бы адслужыцца за маю ласку, што я тады цябе пакінуў жывым. —

МЯДЗЬВЕДЗЬ

Жнеі жалі на пасецы ля лесу. Яны пачулі раптоўны рэў мядзьведзя. Гэты рэў набліжаўся да іх. Яны ўбачылі, што зь лесу выходзіць мядзьведзь і дзіка раве. Яны з калысак пахапалі сваіх дзяцей ды наўцекача куды каторая. Там была старэнькая бабулька, якая не магла бегчы. Села яна на снопе ды чакае сьмерці.

Мядзьведзь, равучы, прышоў проста да бабулькі ды працягнуў да яе акрываўленую лапу. Там была вялікая рана, а ў ране вялікая стрэмка. Бабулька выдрала гэту стрэмку, рану залажыла трыпутнікавым лісьцем ды завярцела чыстай полкай. Мядзьведзь перастаў раўсьці ды, мармочучы, пашоў у лес.

Хутка мядзьведзь зноў вярнуўся да бабулькі й прынёс ёй на карыне пасьценак мёду. Паклаў гэты мёд на сноп перад бабулькай ды, мармочучы, пашоў назад у лес.

КАМАРОВА СЬМЕРЦЬ

Гэй, у лесе, у гушча́ры
Калыхаліся кама́ры.
Дуб да дубу пахіліўся,
Камарок з дубу зваліўся.
Гэй, пабіў камар бакі

Аб дубовыя сукі.
Гэй, пабіў камар калені
Аб дубовае карэньне.
Ляціць муха ратаваці,
Зімнай вадой адліваці.
— Камарочку, родны браце,
Як-жа цябе ратаваці?
— Мне нічога не паможа,
Пакідаю сьвет я божы.
— Камарочку, родны браце,
Дзе-ж нам цябе пахаваці?
— Не хавайце пры даліне,
Бо вырыюць мяне сьвіньне.
— Не хавайце край дарогі,
Бо дратаваць будуць ногі.
Пахавайце там у лесе
Пры зялёненькім гарэсе.

КАЗЁЛ І ЛІСКА

Круцілася ліска, загле́дзеўшыся на курэй, ды ўвалілася ў студню. Студня была няглыбокая, дык яна не ўтапілася, але й вылезьці не магла.

Пачула ліска, што тут блізка ішоў казёл.

— Дабрыдзень, кумок! — гукае яму ліска.

— Дабрыдзень! Што там ліска робіш? —

— Адпачываю, кумок, адпачываю, галубок! Там на версе горача, а тут халадок. І вадзіцы чысьценькай, колькі хочаш! —

Казлу даўна піць хацелася, дык ён і пытае:

— Ці сапраўды там добра? —

— Ай, надта добра! Скачы сюды! —

Дурны казёл узяў і скочыў у студню.

— Ах, які ты нязґраба? І скочыць ня ўмееш. Бач, усю мяне апырскаў. Не хачу я тут быць з табой. —

Ускочыла ліска казлу на хрыбет, а пасьля на рогі ды выскачыла са студні. А казёл тут ледзь не адубеў. Балазе, гаспадар прышоў на ваду, убачыў казла ў студні дый выцягнуў.

ВЕРАБЕЙ

Вось прышлі зімовы сьцюжы,
На двары замерзьлі лужы.
Скача, скача верабей
Ды склікае ўсіх дзяцей.

Да дзяцей ён просьбу мае,
Ён чырыкае, як знае:
— Ціў - ціў - ціў ! Ціў - ціў - ціў !
Дайце зерня, я ледзь жыў !

Есьці многа мне ня трэба.
Трохі зерня, трохі хлеба
Кіньце, дзеці, на зямлю.
Я вам песеньку сьпяю.

ВЕРНЫ ПРЫЯЦЕЛЬ

У ваднаго селяніна быў вялікі сабака. Стаў ён стары й ня мог вартаваць гаспадаровага дабра. Не хацелася селяніну дарма карміць сабакі. Вось ён узяў вяроўку й камень ды пацягнуў сабаку да ракі.

Пазірае сабака на гаспадара сумнымі вачыма, нібы разумее, што той наважыў рабіць.

Сеў гаспадар з сабакам у човен, адплыў ад берагу, прывязаў камень да шыі сабаку ды пірга-

нуў яго нагой у ваду. Човен пахіснуўся й селянін сам уваліўся ў раку.

Гаспадар пачаў тапіцца. Аж чуе, што нехта цягне яго да берагу. Гэта быў ягоны сабака, якога ён хацеў утапіць. Але ад шыі адвязаўся камень, і сабака пачаў ратаваць свайго гаспадара. Схапіў яго зубамі за кашулю, выплыў зь ім на бераг ды, ледзь жывы, расьцягнуўся на беразе.

Заплакаў селянін ад сораму і абняў сабаку. Ён ужо да самай сьмерці карміў і даглядаў свайго вернага прыяцеля.

БУСЛЫ

У садочку пры дарозе,
З даўных часаў на бярозе
Буслы завяліся.
Вельмі было дарагое
Ім гняздо сваё старое —
Навек зь ім зжыліся.



Але людзі захацелі,
Каб то буслы пераселі
На другі бок саду.
Для таго слуп укапалі,
Барану прымацавалі,
Розную прыладу.

Тыя-ж буслы больш цанілі
Гняздо, што дзяды зрабілі.
Яго не зракліся.
Вельмі-ж было дарагое
Ім гняздо сваё старое —
Навек зь ім зжыліся.

ДЗЯДУЛЬКА

Жыў старэнькі дзядулька. Ён ужо ня мог працаваць. Калі садзіўся за стол есьці, дык ягоныя рукі трэсьліся, і страва разьлівалася на стол. Сын і нявестка пачалі яго садзіць у запечку ды налівалі страву ў благую гліняную міску. Аднаго разу ягоныя слабыя рукі ня ўтрымалі міскі. Яна звалілася на падлогу й разьбілася. Пасьля гэтага яму пачалі наліваць страву ў драўляную міску.

У дзеда быў малы ўнучак. Аднаго разу бацька й маці бачаць, што іхны малы сынок нешта майструе. Ён з нажом і долатам завіхаўся пры кавалку дрэва. Бацька ў яго й пытае:

— Што ты хочаш рабіць з гэтага дрэва? —

— Хачу зрабіць карытца. Калі вы з мамай састарэіце, дык тады я вас пасаджу ў запечку ды буду карміць з гэтага карытца,— адказаў хлопчык.

Бацька з маткай пераглянуліся: ім зрабілася сорамна й прыкра. Пасьля гэтага яны пачалі дзядульку садзіць есьці за стол ды карміць з добрай пасудзіны.

БАЦЬКА Й СЫНЫ

Бацька меў некалькі сыноў. Ён усё навучаў іх, каб яны жылі ў згодзе. Але сыны ня слухалі бацькі.

Аднаго разу бацька прынёс венік. Даў яго дужэйшаму сыну ды сказаў пераламаць. Як не намагаўся сын, але ня мог пераламаць веніка. Па чарзе пачалі прабаваць ламаць венік іншыя сыны. Але ніяк не маглі зламаць.

Тады бацька разьвязаў венік, даў галінкі самаму слабейшаму сыну, каб той паламаў іх. Ён лёгка паламаў усе дубчыкі.

А бацька й кажа:

Калі вы будзеце жыць у згодзе, дык ніхто ніколі вас не пераможа. А калі вы будзеце жыць кажны асобна, дык тады вас перамогуць — зломяць, як гэтыя дубчыкі.

А пасьля бацька дадаў:

— Памятайце яшчэ й тое, што згода будуе, а нязгода руйнуе. —

ПОРЫ ГОДУ

Янкавы бацькі былі на заработках у Амэрыцы. Жылі яны ў вялікім месьце Ню Ёрку. Там нарадзіўся й Янка. Калі бацькі сабралі трохі грошы, дык вярнуліся на бацькаўшчыну ў сваю вёску.

Там яны купілі сялібку зямлі ды пачалі працаваць на ўласнай гаспадарцы. Янка апынуўся ў іншым сьвеце, сярод новых сяброў. Ён любіў прыглядацца да жыцьця й прыроды роднай краіны сваіх бацькоў.

—

ЗІМА

Прышла зіма. Мароз закаваў рэчкі й ставы. Дзеці зь вясёлым крыкам бегаюць па лёдзе, коўзаюцца. А якія прыгожыя вузоры намаляваў мароз на вакониых шыбах!

Пасыпаў сьнег. Якія дзіўныя й прыгожыя гэтыя сьняжынкі! Яны, як зоркі. Падаюць часьцей

і гусьцей, ды тоўстым пластам укрываюць зямлю. Дзеці з радасьці качаюцца па сьнегавым дыване.

У ночы зашумеў, загудзеў вецер. Ён пананосіў сувеі-гурбы. Назаўтра дзеці высыпалі на гэтыя гурбы. Яны коўзаюцца на санках, куляюцца ў сьнег, качаюцца ў ім.

Калі пад вясну прыйшла адлега, дык дзеці пачалі гуляць у вайну, кідаючы мяккія сьнежкі. Яны шмат наляпілі сьнегавых дзядоў.

— Ну, і зіма! — кажа Янка. — Якая яна здаровая й прыемная. Добра-б было, каб яна была заўсёды. —

ВЯСНА

Сонца паднялося вышэй. Згінуў сьнег. У палявых ручайках шуміць і булькоча вада. Санажаці й нізіны заліла паводка. Зьявіліся матылькі й мошкі. З выраю прыляцелі птушкі й пачалі свае песьні.

Нахмурылася. Загрымеў першы гром. Пасыпаў спакойны, цёплы, спорны дождж. Ён абмыў зь зямлі смугу, што засталася пасьля сьнегу й паводкі. Зазелянелася травіца й маладая рунь. На іх, нібы срэбра, блішчыць раса.

Дрэвы ў садох, гаёх і лясох пачалі пукацца, зазеляніліся. Сады ўкрыліся белым пахнючым цьветам. Праз цэлы дзень ня сьціхае птушыны сьпеў. Сяляне высыпалі на поле. Яны, як тыя мурашкі, завіхаюцца ў працы каля зямлі.

— Ну, й вясна! — кажа Янка. — Гэтулькі красы й уцехі. Добра было-б, каб вясна была заўсёды.

ЛЕТА

Сонца на небе стаіць высока й добра грэе. Вырасла ярына. На ейных лісткох-пёрках блішчыць крышталёвая раса. Жытнёвым полем плывуць бяскрайныя хвалі. У жыце паказаліся васількі. Санажаці, палі й лясы аж зіхацяць разнакаляровымі краскамі.

Халадком і ягадамі вабіць лес дзяцей. А летняя гарачыня цягне іх да рэчак і ставоў. Там яны купаюцца ў сьвежай, празрыстай вадзіцы, каб асьвяжыць сваё цела.

Надыходзіць час вялікай працы. Бацькі косяць і жнуць, а дзеці ім памагаюць. Як прыемна пахне сьвежае сена. Дзеці любяць спаць у гэтым пахнючым сене.

— Ну, і лета! — кажа Янка. — Гэтулькі харараства й здароўя. Добра-б было, каб гэта лета было заўсёды.

ВОСЕНЬ

Увосень птушкі адлятаюць у вырай. Прырода рыхтуецца да сну й паволі замірае. Але й восень мае сваю красу й прыемнасьць.

На блакітным высокім небе ні хмурынкі. Лагодга сьвеціць сонца. Цёпла. У празрыстым паветры плывуць ніці-павучынкі. Яны заткалі, упрыгожылі поле й санажаць.

Лес укрыўся жоўтым лісьцем, нібы золатам. Жарам чырванеюць рабіна й каліна. А на доле паміж пнёў сінеюць і пахнуць мёдам верасы.

Вароны, гракі, каўкі й шпакі з крыкам хма-

рамі носяцца ў паветры, або плоймам укрываюць апусьцелае поле. На полі зелянее маладая рунь. На бульбяных палетках поўна сялян. Яны выбіраюць бульбу.

Бабіна лета. Гэтак нашы сяляне завуць цудоўныя цёплыя дні восені.

Восень славіцца ня толькі сваім хараством, але, й багатай уродай. Яна напоўніла гумны снапамі й сенам. Сьвірны напаўняе збожжам, а скляпы й істопкі бульбай, гароднінай ды садавінай.

— Ну й восень! — кажа Янка. — Чым-бы жывіліся цэлы год людзі, каб ня ейная багатая ўрода?

СЬНЯЖЫНКІ

Сьняжыначкі, пушыначкі,
Як матылькі ляцелі,
Як красачкі-пралесачкі,
Над хаткамі блішчэлі.
    Бялеліся, мігцеліся
    У розныя калёры.
    Драбнюткія, пякнюткія,
    Як зоранькі, як зоры.
Насіліся, кружыліся
Над ціхімі палямі.
Сьняжыначкі далiначкі
Пакрылі дыванамі.

НА РЭЧЦЫ ЗІМОЙ

Не сядзіцца ў хаце
Хлопчыку малому:
Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому.

— Мамачка - галубка ! —
Просіць ён так міла, —
Можа-б ты на рэчку
Пагуляць пусьціла?
Я ня буду доўга,
Зараз-жа вярнуся.
Трошачкі на рэчцы
У санках паважуся.
— Ну, ідзі пабегай,
Толькі апраніся
Ды, глядзі, ў палонку,
Сынку, не ўваліся. —

ПРЫХОД ВЯСНЫ

Уцякай мароз - дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках булі - гулі!
Песьні чуюцца вясьне.
Ты паслухай, дзед сярдзіты,
Што там чуецца ўгары,
Што за сьпеў за самавіты
У небе правяць песьняры!
А зіма аж пачарнела.
Годзе ёй тут кросны ткаць!
Гэй, маленства, жыва, сьмела
Выйдзем весну прывітаць!

ПРЫВІТАНЬНЕ ВЯСНЫ

Маладая вясна,
Залатая пара!
Будзь красна і ясна,
Не шкадуй нам дабра.

Вокам маткі зірні,
Бледнасьць з твару згані.
Дай уздужаць малым
Пад павевам тваім.
Мы вяночак спляцём,
Табе песьню сьпяём.

ВЯСКОВЫЯ ДЗЕЦІ

Пусты ўлетку нашы сёлы:
Усе на полі за сярпом,
Толькі дзетак крык вясёлы
Льлецца ў вуліцах руччом.

Вецер кудры іх цалуе,
Мые дождж іх бледны твар,
Зь імі сонейка жартуе
І цяпло ім шле, як дар.

СУНІЦЫ

Пранеслася чутка
Па сялянскіх хатах,
Што суніц у лесе
Нарасло багата...

А па купінах
Каля пнёў, лам'я
Чырвань сьпелая
Тых суніц сям'я.
Сакавітыя,
Як налітыя,
Ды ўсе ладныя
Ды панадныя.

У паветры пах
Ад іх носіцца,
Сама ягада
У рот просіцца.

ПРЫХОД ВОСЕНІ

Белыя валокны
Сьцелюцца над долам.
Не сьпяваюць птушкі,
Сьціхнуў лесу гоман.
Сьцелюцца валокны,
Тчэцца павуціна.
Блізка, блізка восень,
Сумная часіна.
Замірае лета,
Заціхаюць далі,
Сірацее рэчка,
Халадзеюць хвалі.

АДЛЁТ ЖУРАВОЎ

У бязьмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Журавы на вырай
Мкнуцца над лясочкам.
Жаласна — прыгожа
Льлюцца ў небе гукі.
Слухаюць лясы іх,
Луг, балота, лукі.
Меншыцца шнурочак
У паднеб'і тае,
Вось ледзь-ледзь чарнее,
Міг — і прападае.

СЫН І МАЦІ

Сын:
— Мамка, мамка, нам сягоньня
Гаманілі ў школе
Аб якойсьці Беларусі,
Што жыве на волі.

Хоць я слухаў вельмі шчыра
(Ня люблю іначай),
Ды ніяк ня мог уцяміць
Што ўсё гэта знача.

Маці:
— А вось тое, мае дзеткі,
Глянь - зірні наўкола:
Бачыш гэтыя сялібы,
Хаткі нашых сёлаў...

А там далей, дзе ўжо вока
Дасягнуць ня можа,
Тое самае пабачыш,
А ўсё так прыгожа!...

Там плывуць Дняпро і Сожа,
Ды Дзьвіна і Нёман,
Велавежы, Налібокаў
Там чуваці гоман.

Гарады там Менск і Вільня,
Магілеў, Гародня,
І Смаленск зь сьцяной цаґланай
Разьляглі выгодна.

Аб вялікай нашай славе
Сьветчаць на сьвет цэлы,
Як жылі мы, панавалі
У родным краі сьмела.

Во ўсё гэта, мае дзеткі,
Ад межаў да межаў
Беларусяю завецца
И да цябе належа.

Сын:
— А! Ужо сьцяміў! Дык багат я,
Меўшы столькі цудаў:
Гэткім чынам я ніколі
Служкаю ня буду.

Ну, але яшчэ ня ўсё тут
Ясным мне здаецца:
Што такое беларускай
Гутаркай завецца?

Маці:
— Ой, дурненькая варона,
Што з табой чыніці!
Як-жа йначай беларусы
Могуць гаманіці?

Як-жа мы з табой гуторым
Вось і ў гэту хвілю?
Як-жа я пяю над зыбкай
Для малой Марылі?

Ды паслухай, як на вёсцы
Кажа дзядзька, цётка;
Як пяюць улетку жнеі
За сваёй работкай?...

Сын:
— Ну, ўжо знаю, знаю, мамка!
Як у люстры бачу.
Пакажу я ўсяму сьвету,
Хто я ды й што значу!

СВАІМ РОЗУМАМ

У школе на аднэй лаўцы сядзелі Пятрусь і Антось. Пятрусь быў жвавы хлопчык. Ён хутка цяміў і спрытна адказваў, аб што пытаў настаўнік. Антось быў ціхі й нясьмелы. Сьпярша падумае, пасьля павольна й паціху адкажа. А Пятрусь яму падказвае ды перашкаджае.

Аднаго разу Антось і просіць настаўніка, каб перасадзіў яго:

— Сяду я лепш на іншае месца, ато Пятрусь не дае мне падумаць, шэпча, каб я гатовае адказваў, а я хачу жыць сваім розумам. —

ПЕРШАЯ КНІЖКА

Першы год Яначка ходзіць у школу, а ўжо навучыўся чытаць і пісаць. Прыдзе Яначка са школы, прынясе кніжку ды чытае ўвечары. Тата й мама слухаюць, як чытае іхны сынок, ды цешацца. А Яначку так спадабаліся кніжкі, што ён і не разлучаецца зь імі.

НАША МОВА

Гэй, ты маці, родна мова,
Гэй, ты звон вялікі, слова!
Звон магучы,
Звон бліскучы,
З срэбра літы,

З злота біты,
Загрымі ты,
Загрымі!

ДОБРАЯ ЗОСЯ

Зося выходзіць у школу, а мама ёй кажа:

— Зоська, на табе хлеба з маслам. Як будзе вялікі перапынак у школе, дык зьясі. —

— Дзякуй, мамачка! — адказала Зося й пабегла ў школу.

Па дзьвёх лекцыях пачаўся вялікі перапынак. Зоська ўзяла свой полудзень і хацела есьці. Але тут яна ўбачыла, што ейная сяброўка Галя сядзіць сумная й зьмізарнелая. Ейныя бацькі вельмі бедныя, жылі ў нястачы.

Зосьцы стала шкада Галі. Яна разламала сваю лустачку хлеба папалам, падыйшла да Галі й дае ёй паўлустачкі дый кажа:

— Галя, на табе крыху хлеба, бо ты можа галодная. —

Галя маўчала. Зоська зразумела, што Галі прыкра браць ад яе хлеб. Тады яна сказала:

— Галя, вазьмі. Я табе даю ад шчырага сэрца.

Галя ўзяла хлеб і пачала есьці. А Зоська была рада, што памагла сваёй сяброўцы.

ШТО ЦЁТКА НАСТАЎНІЦА КАЗАЛА

Была нядзеля. Ніхто з нас у школу не пайшоў. Але сяньня там мая мама, маці Янкі й Касі, Ганны й Антося. Бацькі пайшлі ў школу, каб пачуць ад настаўніцы, як мы вучымся.

Я ведаю, што настаўніца пахваліць нас, бо ўсе мы добра вучымся. А калі мама вярнулася, дык я ў яе адразу й пытаю:

— Што цётка настаўніца сказала пра мяне? —

А мама сьмяецца й кажа:

— Настаўніца казала, што ты вялікі гультай.

Я ведаю, што мама жартуе, але зноў пытаю:

— А ці Янка гультай? І Кася й Ганна таксама гультаі?

— Не, — кажа мама, — толькі ты гультай. — І глядзіць мяне па галаве. Я ведаю, што мама цешыцца зь мяне.

БЕЛАРУСКАЯ ЗЯМЕЛЬКА

Беларуская зямліца
Мяне ўзгадавала.
Маці ў мове беларускай
Песьні мне сьпявала.
Гэта мова і край родны
Над усё мне мілы,
Не магу іх адчурацца
Да самай магілы.
Не магу іх адчурацца
Як рукі, як вока.
Няхай слава Беларусі
Плыве ў сьвет далёка.

НАША БАЦЬКАЎШЧЫНА

Баацькаўшчына — гэта той край, дзе мы нарадзіліся й вырасьлі, дзе жылі нашы бацькі, дзяды й прадзеды, дзе жыве наш народ.

Наша бацькаўшчына даўней называлася ЛІТВА, а цяпер называецца БЕЛАРУСЬ.

Нашу зямлю засяляе наш народ ад найдаўнейшых часоў. Нашы прашчуры аселі на гэтай зямлі ў той час, калі яна была неапрацаваная й дзікая. Яны сваімі рукамі, сваёй бязупыннай працай зрабілі яе ўрадлівай і багатай.

ЗУБРЫ

На нашай бацькаўшчыне шмат лясоў. Там захаваліся яшчэ да нашых дзён дзьве вялікія пушчы: Налібокі й Белавежа. Белавеская пушча славіцца тым, што там да гэтага часу захаваліся вельмі цікавыя зьвяры: зубры, ласі, дзікі й козы. Найбольшая ўвага аддаецца зубрам. Зубр падобны да



нашага быка, а зубрыца да каровы. Зубр розьніцца ад быка тым, што ён шмат большы за быка й надта дужы. Ён мае на сьпіне над лапаткамі вялікі горб, а на шыі й пад барадой доўгую поўсьць. На лобе ён мае моцныя й вострыя рогі, якімі бароніцца ад ворага й нападае на праціўніка.

ЛЮБЛЮ НАШ КРАЙ

Люблю наш край, старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасьце,
Сьлязу нядолі праліла.

Люблю народ наш беларускі
І хаты ў зелені садоў,
Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў.

Люблю раку, што свае воды
Імчыць ў няведамую даль,
І жоўтасьць берагоў пяшчаных,
І яснасьць чыстых яе хваль.

І песьню родную люблю я,
Што дзеўкі ў полі запяюць,
А тоны голасна над нівай
Пераліваюцца, плывуць.

Усё ў краю тым сэрцу міла,
Бо я люблю край родны свой,
Дзе зь першым шчасьцем я спазналась
І з гора першаю сьлязой.



Lemantar, vyd. Zaranka, New York, 1964
Adskanavau Uladzimir Katkouski, pravapis.org, 2002